Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацііі: Вільня, Віленская вул., № 29.

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. ... мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспацэнцііі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна також падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць присланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 25 Сьнежня 1914 г. № 51—52

**Каб не было задзержкі у высылцэ газэты, просім прысылаць патпіску на 1915 г.**

## 1914-ты.

Сыходзіш ты туды, скуль не прыходзюць,
Але сваіх не забярэш сьлядоў...
О, год! такіх, як ты, час рэдка родзіць!
О, год! ты першы гэткі з між гадоў!
Прыйшоў ня з згоды і свабоды весьцяй
I—не ўзвялічыць праўду між людзьмі,—
Жыцьцём мільёнаў ты прыйшоў затрэсьці,
Шлях вымасьціць свой трупамі, касьцмі.
Касьцьлявай зморай з гібелі сталецьцяй
Ты, як прякляцьце, будзеш вызіраць,
I будзе маці страшыць табой дзеці,
Ды клікаць той—хто ўздумае ўміраць.
„Не забіваці“—ты стрывожыў права,
На сэрцэ і душу наклікаў цьму;
Людзей на зьвераў пошэсьцяй крывавай
Перэтварыў і здаў насьледніку свайму.
Га! Хай-жэ льецца кроў, дымяць пажары,
Нехай пад крыжэм плачэ сірата!
Крывавы бог крывавые ахвяры
Сабраць павінен с сьвету да чыста.
Аж прыйдзе іншы год з рукою лёгкай
Агледзіны рабіці новых дзён,
Дзе меч нявідзімаго бога-Рока
Напішэ безкрывавы свой закон.

18/XII—14 г. *Янка Купала.*

## На мяжы двух гадоў.

Вайна, бытцым навальніца, замуціла, разварушыла спакойны ход жыцьця нашаго краю. I ня дзіва: у нас пад бокам ідзе страшэннае змаганьне; цяжар вайны лёг перш-на-перш на плечы нашаго народу; с пагранічных краёў бягуць грамадамі да нас людзі, страціўшые ўсё, што мелі, і вынесшые с-пад куль і бомб адно толькі свае галовы...

Цяпер, агледаючыся назад—на ўвесь год, што дажывае апошніе мінуты,—дужа цяжка зрабіць падрахунак здабыткоў і страт нашаго грамадзянскаго жыцьця. Спорная творчэская работа трывала толькі поўгода і спынілася с першымі стрэламі гармат,—а пасьля пайшлі толькі ахвяры бяз ліку — і людзьмі і дабром. Усё-ж такі, паводлуг старога звычаю, ня будзем лічыць цяпер страт сваіх: яны йшчэ шмат узрастуць—а глянем на той прыбытак, які даў 1914 год беларускаму народу.

Пачатак году суліў добры канец: гэта ўсё пачынало ладзіцца у беларусоў. Ня тое вышло,—а ўсё-ж такі зроблена ня мала.

Асабліва узрос і развіўся беларускі выдавецкі рух,—і гэта найлепшы знак, як узрастае нацыянальная сьведамасьць нашаго народу, як ён рвецца да роднай кніжкі, роднай газэты.

З года ў год узрастае патрэба чытаць беларускае друкаванае слова. Гэта ўжо не забава—не дзеля пацехі, або цікавасьці.—Гэта патрэба душы і сэрца. Чытаюць усё шырэйшые і шырэйшые кругі. А хто прачытаў усё, што дагэтуль здабыла беларуская літэратура, той жадае болей—новаго.

Поруч з гэтым расьце і патрэба пісаць. Узрост нацыянальнай сьведамасьці паклікаў да працы вялікую грамаду людзей. Адны працуюць на грунці прасьветы народу, экономічнаго падняцьця яго, палітыкі; другіе аддаюць свае сілы беларускай літэратуры, паэзіі. I ў гэтай працы выяўляюць сваю душу, свае думкі-ідэалы, свае перэжываньня. Чым багацей душа песьняра-паэта, чым болей ён можэ сказаць сваім братом,—тым вастрэй чуе ён патрэбу пісаць. Расьці доўгі спісак імён беларускіх пісьменнікоў, расьці лік іх твороў,—але яны толькі тады даходзяць да народу, калі яны надрукованы, калі іх кожын можэ купіць за колькі капеек.

I беларускае грамадзянства зразумело, што справа беларускіх выдавецтв — гэта самая пільная цяпер справа. „Беларускае Выдавецкае Таварыство“ у Вільні, петраградзкае „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ“, „Саха“ і „Лучынка“ ў Мінску, каталіцкая суполка „Biełarus“,—урэшці, прыватные асобы, як А. Грыневіч і інш., выпусьцілі ў пачатку 1914 году у сьвет колькі дзесяткоў новых беларускіх кніжэк. Аткрылося й новае выдавецтво студэнтоў-беларусоў у Петраградзі — „Раніца“. Ладзіцца ешчэ адно—ў Мінску.

Выдаваліся розные кніжкі: і літэратурные творы, і паэзіі, і практычные кніжкі, і рэлігійные. Нехватало аднаго: кніжэк для навукі у школі. Гэткіх кніг блізка йшчэ зусім у нас німа, апрача пачатковаго навучаньня чытаць. Не прыдбалі мы іх і сёлета: хаця некаторые з іх ужо апрацовываліся у рукапісах, аднак пачатак вайны прымусіў спыніць гэту работу, адлажыць да лепшых часоў..

Але і выдрукаваць кніжку—гэта йшчэ ня ўсё: трэба парупіцца, каб яна дайшла да народу. Вось, сёлета багата было зроблена дзеля пашырэньня беларускаго друкаванаго слова: сьледам за „Беларускай Кнігарняй“ у Вільні аткрыліся гэткіе-ж кнігарні ў Полацку і Мінску і памечэны у другіх гарадох Беларусі.

Нельга абмінуць моўчкі тых праяў, што паўсталі з узростам беларускаго пісьменства. На першым мейсцы ад'значым перамену ў паглядах нашых селян на беларускую кніжку: яны цэнюць яе, яны шукаюць яе, яна—іх. Нікога ўжо ня дзівіць, што кніжкі друкуюцца і па беларуску: беларуская мова заваевала сабе пачэснае мейсцо у сьведамасьці ня толькі інтэлігентоў, але і найменш асьвечоных людзей. Яе прыймаюць, як роўную другім.

Гэтаго мала. Беларуская мова пачынае ўбівацца памалу туды, куды яе дагэтуль непускалі

С таго часу, як з'явіліся рэлігійные кніжкі па беларуску (—каталіцкіе): катэхізмы, сьвятая гісторыя, выясьненьне абрадоў касьцельных ды іншые, — тые ксяндзы-беларусы, каторые не адрэкліся ад свайго народу, пачалі вучыць дзяцей асноў веры па беларуску. Гэта—вялікі крок уперод на дарозі да здабыцьця праваў для нашай мовы ў каталіцкім касьцелі.

Трэба сказаць, што і агульнае навучаньне у прыватных пачатковых школах (у „комплектах“) людзі пачынаюць вясьці па беларуску,—прынамсі тлумачаць дзецям усё ў іх роднай мові. Хоць гэта—кропля ў моры, мяркуючы да таго, колькі нашых дзяцей вучаць чужые людзі ў чужой мові...

Ня будзем гаварыць аб іншых баках нашаго грамадзянскаго жыцьця: аб адных цяпер гаварыць нельга, іншые, здавалося, што павінны шыбка развівацца, замерлі с пачаткам ваеннай завірухі.

За тое сьведомая частка беларускаго грамадзянства, ня могучы працаваць дзеля культурна-нацыянальнаго і экономічнаго адраджэньня народу нашаго, усё часьцей выступае у агульна-краёвым жыцьці, як паметная сіла.

Багата нашых таварышоў у працы адарвала вайна ад роднай нівы,—але тые, што асталіся, ахвотне аддаюць свае сілы на падмогу пацярпеўшым ад вайны бліжнім. Беларусы поруч з прэдстаўнікамі усіх тутэйшых нацый працуюць у камітэтах і таварыствах дзеля апекі над сем'ямі запасных, дзеля помачы паўцекаўшым з родных мейсц, зруйнаваных у часі бітв. Беларускае грамадзянство шчыра атклікаецца на ўсе патрэбы народу і краю, селяне дзеляцца сваім дабром і памагаюць працай сваей у гаспадарках, дзе не асталося рабочых рук, на'т слалі грошы братам—польскім селянам.

У агульна-краевай працы мы спатыкаемся з людзьмі іншых нацый, с каторымі жывем ад векоў, але былі мала знаёмы. Цяпер адны адных пачынаюць лепей пазнаваць, пачынаюць адны адных цэніць і лічыцца с чужымі думкамі і жаданьнямі. Гэта відаць хаця-бы с таго, што ва ўсіх грамадзкіх справах уселякіе абвесткі, афішкі, ды іншые выданьня друкуюцца ў нас у

пяці краёвых мовах, — у тым ліку па беларуску.

Цяжкі, сумны час перэжывае наш народ і ўвесь край. Але поруч з гэтым выяўляецца моц нашаго народу, каторы не апускае ўжо рук ад першай бяды, выяўляецца і тое, што ўсе нацii краю могуць, калі захочуць, працаваць у згодзі і еднасьці—дзеля карысьці супольнай бацькоўшчыны нашай, нашаго краю. І на гэтым апіраецца наша надзея, што мінецца час ліхалецьця і ясная зорка ўсім нам ярка засьвеціць.

а—н—а.

# ВАЙНА.

19 сьнежня, а дзесятай гадзіне вечэра вярнуўся у Царскае Сяло Гасудар Імпэратар с падарожы на Каўказ і ў ваюючую армію.

---

**На Ўсходнім фронце**, у Завісьленскім (польскім) районе крывавые бітвы і заўзятые атакі—то расейцоў, то немцоў — адбываліся праз увесь тыдзень безупынна. Павэдлуг вестак Штабу, бітвы ішлі за гэты час у такім парадку: 15 сьнежня паміж дольным цячэньнем **Віслы і Пiліцы** адбываліся невялікіе бітвы. Немцы ачысьцілі акопы на правым беразі Бзуры каля вёскі Містжэвіцэ і адыйшлі на левы берэг. На **Раве** расейская цяжкая артылерыя карысна змагаецца с цяжкай нямецкай артылерыей, якой вельмі шмат У районе **Болімова** ішлі атакі расейскіе і нямецкіе па чародзі. Паміж Піліцай і верхней Віслай у цэнтры толькі перэстрэлка, на абадвух-же крылах расейцы пасоўваліся наперад. 16 сьнежня наступаючы ад Болімова пад расейскім агнём, немцы уварваліся ў Панскі Двор, Божымов і ў расейскіе акопы каля Гуміна, але затым расейскай быстрай проці-атакай ўсе уварваўшыеся на пазыціі былі пераколоты. Каля *Іновлодзі* расейскае войска ўзяло расположэные к поўдню ад вёскі нямецкіе акопы і ўварваліся ў вёску, у якой 16 сьнежня завязалося бітва. Крыху на поўдня ад Малогошчы атака праціўніка адбіта расейскім агнём. Каля вёскі Бохінец немцы заўладалі расейскімі акопамі, але наступіўшай проці-атакай былі выбіты з яго і аткінуты назад. 17 сьнежня паміж Віслай і Піліцай расейцы адбілі ночную і днеўную нямецкую атаку к паўдню ад дарогі Волінов—Медневіцэ. К поўначы ад Равы наступаньне немцоў стрэчэно было расейскай проці-атакай на штыхі, прычым праціўнік і тут быў аткінуты. На некаторых участках пры адбіваньні нямецкіх атак расейцы с карысьцю ужывалі ручных гранат. Бітва каля Іновлодзі выклікала пераход непрыяцеля ў наступленьне ад Томашов у напрамку к Опочну, але на поўдарозі расейцы адбілі яго атакі. Са стратамі адбіто такжэ наступленьне аўстрыякоў каля **Малогошча** і к паўдню ад Пінчова каля Закрэва. 18 сьнежня паміж дольнай Віслай і Піліцай немцы зрабілі некольки атак, паттрымліваных агнём вельмі вялікіх гармат. Расейскае войска, быўшае на левым беразе Бзуры каля Вітковіц, адбіло дзьве ночные атакі. На Равцэ расейцы адбілі атаку на Долецк. 18 сьнежня непрыяцель асабліва заўзята напіраў каля Равы у районе паміж уплывамі Бялкі і і Рылькі. Бітва тут ешчэ цягнецца. К паўдню ад Піліцы бітвы развіваюцца на пазыціях, загараджываючых дарогу ад Влошчовы к Кельцам каля Лукашно—Міхала-Гора — Вольміно—Поліхно. 19 сьнежня, на Бзуры і Равцы, ня гледзючы на агонь непрыяцельскай цяжкай артылеры і кіданьня мін, расейцы карысна адбіваюць атакі немцоў. На шасе ад Блошчовы ў Кельцы. у районе вёскі Лопушно, 18 сьнежня нямецкае войска пасьля заўзятай бітвы захапіло часьць расейскіх акопоў, але зробленай проці атакай праціўнік быў выбіты з усіх занятых ім акопоў, прычым расейцы захапілі колькісот палонных і 9 кулемётоў. 20 сьнежня па ўсім фронце леваго берагу Віслы вядзецца сільны гарматні агонь. У ночы на 20 сьнежня немцы сталі перэпраўляцца цераз Бзуру каля Панскаго Двара і Козлов—Біскупі. Калі ўжо перэбралося с колькісот людзей, расейцы кінуліся бяз выстрэлу на штыхі, і амаль ня ўвесь атрад быў зусім знiстожэны. Заўзятые і крывавые бітвы адбываліся усю ноч да раніцы. 20 сьнежня ў районі к поўначы-ўсходу ад Равы, расейцом удалося выбіць немцоў з некаторых акопоў, захопленых праціўнікам раней к поўдню ад Піліцы. Бітвы адбываліся каля хутара Гашэк, к захаду ад Іновлодзі, і к поўдня-ўсходу ад Малагошча, каля Вольміна, гдзе расейцы адбілі нямецкіе атакі. У **Заходняй Галіччыне** 15 сьнежня ня гледзючы на непралазнае балота, расейцы пасоўваліся напeрад і атцiснулі праціўніка с фронту Громнік—Горліца—Ясліска, прычым захапілі гарматы і шмат кулемётоў. 16 сьнежня к поўдня-захаду ад Дуклы расейскае войска некольки штыхавымі атакамі аткінулі аўстрыякоў з іх умацаванай пазыції каля Крэмпы і Тылавы і змусілі праціўніка уцячы. Проці-атакі аўстрыякоў у **Карпатах** і на перэвале **Ужок**, а такжэ новые рылазкі с Перамышля расейцы адбілі. 17 сьнежня у Заходней Галіччыне расейскае войска узяло укрaпленьня на высотах к паўдню ад Котан і Крэмпы, на поўнач ад Барвінэк і к поўдня-захаду ад ясліска У районе Балігрода, на поўдня ад Ліско, карыснымі атакамі на штыхі расейцы задалі праціўніку вялікіе страты, ніштожучы у бітве на штыхі цэлые яго роты. 18 сьнежня расейцы карысна атакавалі праціўніка ў районі Горліцэ на участку Мшанка—Ропіца. Нягледзючы на найзаўзятшые супраціўленьне праціўніка, расейцы заўладалі тут прыступам яго украпленьнямі на высотах і вёскай Мшанка. Страшэнна заядлые проці-атакі праціўніка, паттрымліваные узброенымі аўтомобілямі, адбіваюцца агнём, штыхамі і ручнымі гранатамі. **У Буковіне** расейцамі заняты з боем Сторонец і Радауц. 20 сьнежня у Галіччыне у районе Горліцэ—Заклічын бітвы не спыняюцца. У Буковіне і ў районе перэвалоў Ужок і Ростокі расейскае наступленьне ідзе далей. У бітвах з аўстрыякамі узята расейцамі шмат палонных і ваеннай здабычы.

**На Какаўзкім фронце** страшэнна заўзятые і крывавые бітвы ідуць у Саракамышскім напрамку з немалымі турэцкімі сіламі. Рэзультатоў гэтых бітвоў ешчэ німашака, толькі туркі нясуць вялікіе страты. На Ольцінскім напрамку расейскае войска, перайшоўшы ў наступленьне, занялі Мардэнэк. Наступленьне турак тутака спынілася. На лініі Сокомер—Хоросогі колькі заўзятых турэцкіх атак былі адбіты расейскімі штыхавымі проці-атакамі. Часьць турэцкіх сіл зграмаджываецца ў районі Ягулышчымскій перэвал—Багдад і наступае на Ардаган.

У Тыфлісе с прычыны трывожных слухоў і выезду жыхароў, губэрнатар абвесьціў, што городу ніякая небаспечнасьць ня грозіць. Што вываз з гораду часьці казённаго дабра і сем'яў служачых

---

# Ё Н.

— Не!.. Лепш корціку... бо мультану такому верхатропу і на тыдзень ня хопіць,—як відзіш калені аблысеюць... Ат! калі мала гада шліфую, ой мала! Чаму гэта. Я, калі быў малы, дык злепюць, бывала, с стар'я і цягаеш па некольки год. Помню, толькі аднаго разу, дык пашматаў вопратку на кускі. Было ужо добра цёмна, я гнаў гусей дамоў якраз каля тых волатовак *), дзе страхацьцё здаецца, як мне тады казалі. Раптам: куга-а! куга-а! Але ці-ж я зразумеў, што гэта сава,—мне здалося, што там цэлое пекла адазвалося; я кінуўся на уцёк, праз хмызняк, на цяньки, ды пакапіўся, як клубок. Сукі дзёрлі вопратку, цела, але я чуў толькі страх: вялікі, магутны, незразумелы. Уваліўся я ў хату і страх—за мной; мацi мяне туліць, усьцішае, а я крычу незразумелые словы, вытрашчыў вочы і ўсё азіраю плечы, бо здавалося, што страх сядзіць учарэпіўшыся габдзюрамі, што ён расплыўся там, пад скурай.

Сьмешна, дзіўна і так усё проста дзеіцца на гэтым сьвеці.

Ці-ж тады я блазан, думаў, што праз нейкіе дваццаць год, у тую памятную восень, я, захоплены ўвесь цікавасьцяй, буду рыцца, як крот, у гэтых-жэ валатоўках, разварачываць косьці, раз'едзенае іржой аружжа, жалезства,—што у ноч ціхую, лятунковую, калі дэлікатны сьняжок, як лугавые матылькі, ледзьве-дзе пырхаў над чорнай зямлёй, буду я сядзець сярод касьцей, праставалосы, гарачы, як прысак, і з гордасьцяй туліць, шчэрбаты выскалены чэрап. І помню у думках плыла дзіўная, а так жудасна прыгожая словы-музыка, як шэпты тых саромлівых елак, каторых карэньня тарчачало з разрытаго пяску...

...Добра, ой як добра мне сярод вас, косьці векавые! Вядзіце вы, сьведкі тых слаўных часоў! Вядзіце мяне, здрабнелаго, па сваіх сьлядох цераз пушчу, бель, балоты. Вядзіце!.. Вун дубовые калоды тонуць у дрыгве, другі, трэцьці рад і грэбля — дарога раздзелам кладзецца цераз непраходные багны, праз нярушэнные адвечные лясы, пужаючы ласей, рысамах, трывожучы непаваротліва-лянівых медзьвядзёў... Яшчэ шаг, яшчэ, і, як вокам кінуць—шыр рэкі, а па ёй плывуць караблі, лайбы з заморскім дабром, а карэнастые корнікі, асначы, вывіваючыся памеж каменьнёў, што павыторківалі русалкі, кідаюць хлеб, соль і робюць таёмные знакі. Гэй, корнік, ці аснач, пусьці мяне на сваё мейсьцэ, навучы песьні свaей, вазьмі с сабой, вазьмі! Глянь, як мне кволаму, з разбітай душой трудна на гэтым пустым, скалістым востраве, пакрытым гідкім, скоўзкім наростам; і падзецца недзе, усе чужые, і слова з некім сказаць... Пашкадуй! Вазьмі! Але нема яго, нема іх; прапалі, праехалі с песьняй, здаровые, само жыцьцё, паехалі далёка, у ніз па рэцэ, у сінію даль, разганяючы пужлівых ласеў, што цягалі маўру з дна рэкі. Нема іх растаялі, зніклі, як сон. Але яны былі! ой, як добра, што яны былі...

О, Пярун, усемагутны сын Белуна! што-ж гэта такое гнеў твой, пошэсьць, ці то голад так злажылі людзей у вялікіе сьцірды павыкручывалі у страшные нявыгадные паставы, зупрудзілі рэку, закідалі грэблю? І паветра затручываецца, і чэрві множацца, і груганы, звяры сілкуюцца, і русалкі густаюць адзервянелых удальцоў, і цягнуць з берагу у рэку, і пяюць песьню такую: «Люлі, люлі! Гой, гой! Ты мой, на век мой. Уха, ха! Бух! с табой на дно пухавое, бо ты мой, бо ты мой!» А вун лясуны адзін, другі вылезьлі з лесу, на казлячых нагах, лахматые ад моху, непрытульные і пачалі шыбаць сукамі у русалак, а тые давай наругацца: «лясун-ласун, лясун-ласун; вораг лес табе папсуў, а князь полацкі укрыў грэблю смерцякамі. Лясун-ласун!»

Ага-а-а, во як! Гэта князь полацкі наказаў вас, злыдні. Добра! ня лезьце, паганцы, у чужое, не трывожце спакойных жыхароў, ня лійце нявіннай крыві, сьлёз... Га, належнае атрымалі, а князь полацкі астаўся князям, грозным і магутным. Не вярнуцца болей вам! Ха, ха, ха—не вярнуцца болей вам... Сюды, князь, сюды, хадзі, вызваль ратуй! Душна, чадна, трудна нам. Вызваль сілачкай сваей, дай жыцьцё нам, вярні кроў...

Божэ, Божэ, адны косьці, косьці, косьці... Ціха, ціха, усе маўчаць, толькі елкі, якіх карэньні жыць пачалі меж касьцей, шумяць сабе так таёмна, шумяць сабе ў высь. Усе чужые, кожны вораг; сумна, сумна, ім; нема долі, нема князя... Эх, аднакжэ князь тут жыў, ай, як добра, ай, як слаўна, што ён тут калісьці жыў...

І падняўшы галаву горды, поўны сілы, быццам волат, агляну́ўся я дакола: замкавішчы, валатоўкі, руіны, кожная пядзь зямлі — летапісь, а я і мы жывём на гэтай зямлі сярод прадзедоўскіх магіл як чужынцы, як пасяленцы, як найміты: сына не цікавіць, як жыў дзед, бацька забыўся аб славе прадзеда, і нітка, што звязывала у адно супольнае, мудра-багатае жыцьцё, перэрываецца. А што далей будзе? Браты-людзі што далей будзе? Брррр... Жудасна... Не! Я не такі! далей ад вас, глухіх, сьляпых, далей! Я не саромлюся, не баюся туліць і цалаваць векавые косьці, я іх шаную і слаўлю, бо яны маюць больш жыцьця, больш моцы, як і вы. Добра, ой як добра мне сярод вас, косьці векавые! Я веру, моцна веру ў вас, у сябе, у будучыну; за веру жыцьцё аддам, я прысягаю...

Цьфу! Згінь ты, прападзі! То-ж ужо добры дзень! Жартачкі!.. Разлятуціўся, задумаўся стары дзед, а тут на службу трэба ісьці; сьвята пад бокам... наградные.. Цьфу!...

— Жонка! Жонка! Чуіш!? Уставай, гарбату ладзь! Фі-ій, чорт ведае што! Цэлую ноч дурыў сабе галаву.

— Тым часам, вочы яго, аббегшы спальню затрымаліся на унівэрсытэцкім значку з новаго золата, што блішчэў фальшывым вотблескам на чыноўніцкай жакетцэ, і злосьць яго агарнула, чаму ён, с такім значком, а сядзіць вун колькі ужо часу памошнікам.

— Не, ня спрыцен я! Чаму-бы не сказаць упраўляючэму, што у шчэтавода галава трасецца ад п'янства?

**Л. Р.**

---

*) курганоў.

Выюць там па іх віхоры,
Сьнег расьцець у гурбы-горы,
Гурбы-горы кроў фарбуець,
Тую кроў ваўкі смакуюць...

**Ясакар.**

Вільня. 5/XII—14 г.

## З народных песень.

**Зажурыўся ясны сакалочэк... *)**

Зажурыўся ясны сакалочэк,
Што не рано з выраю вылетае:
Негдзе сесьці, гнезда звіці.
Сяду-паду у вішнёвым саду,
Саўю гняздочка з зялёнаго дрэва.
За гарою сьцягі выпадалі,
На даліне быстры рэчкі сталі;
Ўсе салдаты ў паход выступалі.
Ў агародзе зацьвітала рожа;
Пазнала матка сына ў паходзе.
Вярніся, сынку, да дому,—
Змыю табе белу галоўку.
—Змывай, маці, сабе, ня мне,
У полі—дажджэ дробные,—
Змыюць-жэ мне дажджэ дробные,
А высушуць ветры буйные.
—Вярніся, сынку, да дому,—
Пасьцялю табе белу пасьцельку.
—Сьцялі, маці, сабе, ня мне,
Ой ў полі трава шаўковая,—
Для салдата пасьцель гатовая.
Яловая шышачка—
Салдацкая падушэчка.
Кляновым лісточкам апранусе,
С сваім таварышам высплюся.

**Зашумела дубровачка...**).**

Зашумела дубровачка зялёная,
Заплакала ўдовачка маладая.
Ня шум, ня шум, зялёная дубровачка,
Не плач, не плач, маладая удовачка!
Не далёка муж паехаў — да Варшавы.
А ў Варшаві, слаўным месьці
Барабаны б'юць выбіваюць,—
Маладых рэкруцікоў выбіраюць:
Каторые халастые—скокі скачуць,
А каторые жэнаты—сільна плачуць.
«О цяпер-жэ мы, пане браце, запрапалі:
«Застаюцца нашы жонкі удовамі,
«Застаюцца нашы дзеці сіротамі.
«Ды гуляй, мая міла, як гуляла,
«Ды не гуляй, мая міла, з малойцамі,
«Ды гуляй, мая міла, са старымі,
«Бо старые, мая міла, раду радзюць,
«Маладые, мая міла, с сьвету збавюць».

*) *J. Czeczot* «Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny». Вільня, 1846 г.

**) *П.В. Шэйнъ.* «Матеріалы для изученія быта и языка русскаго населенія Сѣв.-Зап. края». Том I, часьць 1. Пеграград, 1887 г.

## Пад сьпеу ветра.

Нудна гудзіць вецер за вакном, ляпае нечым аб сьцяну, на колькі галасоў заліваецца ў коміне. Пад гэты нудны сьпеў ветра, ў галаве адна за аднэй плывуць такіе-ж нудные думкі, як і гэта адвечная вятровая песьня.

Вось і новы год ідзе. І нясе ён каму горэ, каму радасьць, каму шчасьце, каму нешчасьце. І чэкаюць яго усе з нецярпеньнем, с трывогай у сэрцы. Чэкаюць новаго году, чэкаюць перамены. Чэкаем і мы, беларусы, чэкаем і надзеемся: а мо і нас бяздольных ён успомне, мо і нам прынясе якую радасьць, якую перамену.

Чэкаем... а ці прынясе? ці ўспомне? Ужо многа гэткіх гадоў прыходзіла, вельмі многа, а натта мала прынясьлі яны добраго нешчаснаму, гаротнаму беларусу. А мо гэты год лепшы? мо ласкавейшы будзе? Будзем чэкаць, будзем спадзевацца...

А вецяр гудзіць і гудзіць І плывуць перад вачыма адзін за адным сумные малюнкі Беларусі-маткі.

Узгоркі, пералескі, лугі с пажаўцеўшымі стагамі сена, крывые, выбоістые дарогі с старымі, старымі крыжамі на перахрэстках і вёскі.. маленькіе, балотные, с паразваліваўшыміся, чуць ня бяз стрэх, хатамі. І, гледзючы на гэтые малюнкі, ціхая, пакорлівая нуда ахоплівае душу.

Гудзіць вецер, стогнуць старые ліпы і пужліва пазіраець у маё вакно праз голае сучча круглы месяц. А малюнкі плывуць і плывуць.

Вось прада мной наш мужык-беларус.

У лапцях, у благой шэрай сермязе, з мазолістымі рукамі, забіты, застрашаны.

Усюды, усюды я пазнаю яго па яго баязліваму пагляду.

І хочэцца плакаць, хочэцца крычаць ад жалю! Чаму-ж чаму такая несправядлівасьць, чаму бедны хлебароб—беларус у такім загнаньні!? Хочэцца ва ўсе грудзі крыкнуць: ачніся беларус, годзі спаць табе! Пара ўставаць, пара прымацца за работу, за вялізарную культурную работу.

А вецяр усё гудзіць і гудзіць. Жаласна стогнуць за вакном старые, дуплаватые ліпы, злосна махаюць голымі галінамі як-бы каго завуць, як бы на каго сваруцца. І пяе комін, як стогалосая жалейка.

Сумна на душы, сумна і кроіцца яна ад болю на часьці...

**Янка Чарот.**

## Спатканьне.

(Бязмерны абшар. Шлях асьвечаецца далёкімі пажарышчамі. Грымяць гарматы. Ідзець згорбіўшыся у тры пагібелі дзядуля — Стары Год. Стаіць яму на спатканьне стромкі малады дзяцюк — Новы Год).

Стары год. Вось, як той кажэ, і канчаю жыцьцё сваё! Глыбокіе раны пакрылі ўсё цело маё... вочы мае асьлеплі ат сьлёз крывавых... дыхнуць не магу ад безупынных стагнаньнёў... валасы мае выліняли, вушы аглухлі ад грымотаў сьмерці... О, як я рад, што час супачынку падыходзіць, бо ня люба мне жыць было!..

Новы год. Дзень добры, дзядулька! А які-ж ты страшны! Ці гэтак дрэнна жыць на сьвеце?

Стары. Так, так, кепскіе часы, сынку мой!

Новы. Як ты цярпеў, відаць; я бачу у цябе сьляды вялікіх пакут... бязмернаго гора!..

Стары. Але, але, сынку мой, ніколі сьвет не бачыў гэткіх рабункоў, як пры мне!..

Новы. Як я палохоюся!.. Што-ж мне трэба будзе рабіць?

Стары. Пайсьці далей па гэтаму стараму шляху...

Новы. А што мяне чэкае?

Стары. Шмат, сынку, пытацца любіш. Сам пабачыш.

Новы. Як я палохаюся!

Стары. Эт, глупства! тое што прайшло—ужо німа, а што павінна быць—усё роўна будзе!

Новы. А хто мой шлях будзе асьвечаць?

Стары. На ўсходзе неба ёсьць ясная зорка, — яна заўсёды ўсім братом нашым на сам пачатак дарогу паказываець.

Новы (уцешыўшыся). Зорка, кажэш? На усходзі?!

Стары. Але! Яна калісьці вела волхваў да крыніцы Дабраты Вялікай.

Новы. Што гэта Вялікая Дабрата?

Стары. Сам я гэтаго не бачыў, але кажуць, што гэта—шчасьце людзкое, што гэта—сонцэ жыцьця.

Новы. А зорка давела волхваў да таго сонца жыцьця?

Стары. Яны ў сьне толькі бачылі гэта, але...

Новы (устрывожэна). Што—але?

Стары. Але і цяпер яшчэ шукаюць...

Новы. А хто гэтые волхвы?

Стары. Гэта—людзі, каторые галовамі сваімі упіраюцца у самае неба, а ступнямі капаюцца глыбока у зямлі. Увакруг іх з'яюць праменьні думак вялікіх, а у іх сэрцах шыпяць тые старадаўніе зьмеі грэхаводзтва. Ніколі

---

кі-гэткі пачастунак... А цяпер? Пцьху!!. Прабіраіць бывала баба, калі дамоў ня ў свой час трапішся: п'яніца!.. Ня буду сьпірацца—піў! Але-ж ці я за выпітае плаціў? Звалі, давалі — дык і піў,—што-ж тут благога? У другім мейсцы, бываець, ня можна і абыйсьціся, каб ня піць—ну, і піў—ня буду казаць, — піў і меў... а цяпер? Ня п'ю... Праўда! Але што-ж з гэтаго? І сьвятым не зрабіўся і што трэба таго нема. Во боты разваліліся. Карова у хлеві галодная равець, парасё склыгочыць, дзеці скавылюць... Жалованьня?.. ці-ж яго на ўсё хопіць... Грызець жонка, як іржа жалеза: —«Ты схадзіў бы куды! А можэ-ш аткуль што небудзь якое... Пад лежачую калоду, кажуць тые людзі,—і вада не цячэць...» А чорт вас усіх задзяры і з жыцьцём з гэткім разам!.. Ці ня дурэнь жэ баба, каб хто спытаўся. Ну, куды-ж я пайду? Якіе справы завяду, калі ўсе цяпер, як шчэмялі ў дождж, ціханька седзяць. Прысучыся-ж, прычапіся цяпер да каго. Гарэлкі нема—і прыступу да людзей нема.

Надовічы, можа гэткай парой, а можа трохі і раней, Арцём Зграбны зусім замучыў сябе такімі думкамі. Так яму зрабілася цяжка, так горка і з дасады так захацелася выпіць, што муся быць ён ахвяраваўся-б у Ерусалім пехатой схадзіць, каб хто толькі даў гарэлкі. Нічога аб гэтым ня ведаючы, жонка, як і заўсёды пачала пілаваць Арцёма, чаму ён ня сходзіць і не пасочыць якога палатунку.

— Во ў Алёксы Салятыркі хрэсьбіны. Патцікаваўся-б не ўзнаку. Самагонка пэўні будзець. Накрыў-бы. Пакуль суд ды дзела, а так сама што нібудзь і...

Бабы Арцём неколі дужа не любіў слухаць, а на гэты раз схамянуўся і нават не даў ёй дагукаць.

— А ці ведаеш, баба, праўду ты і кажэш. Гэтых гіцлеў самакураў даўно-бы трэ' было павучыць. І, дакурыўшы папіросіну, Зграбны нацягнуў шынэль, прычапіў шашку, націснуў шапку і, выходзючы за дзьверы, бытцам прарочучы сам сабе сказаў:

— Можа прыдзецца і замарудзіць,—вядома-ж усяк бываець,—але я хоць с позным дамоў усё такі прыду, дык ты-ж тут дзеля гэтаго наноч не запірайся.

— Ну, добра, добра! Ідзі з Божэнькам, ды варочайся ў добры час. А я, хоць і запруся, спаць крэпка ня буду, — буду цябе чэкаць,—атказала жонка.

Праз усю дарогу Зграбны думаў аб тым, як ён накрыець Салятырку, як срога пачнець пісаць пратакол, як той перэпужаецца ды будзець прасіцца і маліцца, як ахвяруецца ніколі самагонкі не рабіць і ня піць, як пасуліць яму... ну, за тым... як ён, Зграбны, скажэць: «Ну, за гэта дзякую, а там вечэрком каторага дня, калі табе выгадней будзець, сам прывязеш Маё дзела ведаеш, пехатное... Толькі-ж глядзі нікому нічога ані шэп! І сам, брацец, перэстань, бо пратакол у мяне: калі што якое, дык я яго, брат, і туды... То-то!..»

С Салятыркай Зграбны спаткаўся у сянёх.

— Вось я, брат, да цябе, Салятырка, з дзелам! .

— Проша, проша!.. А з якім?..

— Січас узнаеш!. Яшчэ пытаецца!..

— ?!

«А ў нас бяседа, хвала Табе Божа!..
Ды й застагнала Ганулька ў полазі,
Ды й зажадала вішнёваго соку.
А пазавіця Алёксачку с току,
Нехай прынясець вішневаго соку...»

Пеялі бабы. Хрэсьбіны ужо скакаліся. Нават у сянёх пахла самагонкай.

— Банкет спраўляеш?

— Як відзіш,—Бог сына паслаў. Зграбны абвёў вачамі Салятырку з ног да галавы і ўгледзіў у кішані таўстую, чорную бутэльку.

— Ага! што гэта у цябе?!

— Бутэлька.

— А ў бутэльцы?

— Чуеш-жа—бабы пяюць—сок...

— Сок, сок! Я табе пакажу сок! Самагонка мусіць?..

— Ня сок, дык віно, а толькі-ж не самагонка.

— Ілжэш!

— Дадушы-ж, віно!

— Пакажы!.. Ну, вот!—і сьмярдзіць і горкае. Я-ж кажу—са-ма-гонка.

— Крый Божа! Так паказалася... Зграбны яшчэ пакаштаваў.

— Як сабе хочэш, а самагонка...

— Што за дзіва?! Сказаў-бы — бутэлька... Ды ты лепі пацягні, асмакуйся...

Зграбны ёмка палымнуў, пасмакаваў...

— Яшчэ, яшчэ!..

Ён і яшчэ...

— Яшчэ!

І яшчэ...

— Ну?!

— Гм...

У Зграбнаго пачало круціцца ў галаве..

— Пойдзем у варыўню, — сказаў Алёкса, — там хоць закусім, а так табе і дрэнна зробіцца і нічога не даведаешся.

У варыўні Зграбны піў ужо не пытаючыся што; закусываў, ізноў піў і, як і трэба быць, казаў Алёксу: «здароў будзь!», а, калі піў Алёкса да яго, атказываў — «на здароў'е!..»

— Дзе ты тут падзеўся!—загаманіў улазючы у варыўню стрэчны брат Алёксы, Максім Карнаты: сядзім бяз толку, а ты, як пайшоў па масла, дык і ў печы пагасла.

— Зараз, зараз! Тут вось толькі трохі с панам стражнікам замарудзіў.

— А ў хату чаму яго не вядзеш? Што ён там за ацэсар такі, што ад людзей туляецца!..

— Што-ж, пойдзем?—зьвярнуўся Алёкса да Зграбнаго.

Зграбны ахвотна згадзіўся. «Вішнёвы сок» цеплатой, жарам біў яму ў твар, кружыў галаву, — рабілася натта вясёла; прабудзілася патрэба яшчэ і яшчэ выпіць,—выпіць і падурэць...

Зграбнаго пасадзілі на пачэсным мейсцы, каля кумоў. І тут ён піў. За тое, што ён запазьніўся, яго за кожным разам прымушалі піць па дзьве, па тры чаркі, і ён піў...

— Трэба, трэба пану стражніку нядоімкі ўносіць,—трэба!.. І ён уносіў. Ат кожнай выпітай чаркі ён рабіўся ўсё весялей і ласка-

ня могуць яны падзяліць паміж сабою багатаго скарбу зямлі... Робюцца яны тымі пасынкамі Адама, каторые прабіваюць сабе дарогу у жыцьці клыкамі і кіпцямі.. Успамінаючы імя Вялікаго, яны забіваюць...

Н о в ы. О! якое гэта будзе маё жыцьцё!.. (агледаецца цікавым вокам увакруг).

С т а р ы. Твой пачатак, як мой канец...

Н о в ы г о д. А далей?..

С т а р ы г о д. ?..

. . . . . . . . . . . . . . . .

У далі на ўсходзе неба зазіяла зорка. Анёлы белакрылые пяюць малітва-песьні. Новы год атуляецца туманам неразгаданых варожбаў. Вочы яго арліные пазіраюць на зіяючую зорку і чытаюць вялікіе таёмнасьці быцьця.

**Змітрок Бядуля.**

---

# Каляды.

У ўсіх паганскіх народоў сонцэ, месяц, земля, агонь, вада вецер і розные іншые праявы прыроды мелі чэсьць божу. Аднакжэ сонцэ і месяц лічылі за глаўных багоў, называлі іх у розных старонках розна, кожны народ у сваей мове. Грэкі называлі бога сонца Гэліос, славяне Пяруном і т. п. Але ва ўсіх паганскіх верах думалі, што сонцэ, бог сьветла, ваюе вечна з богам цемні. Змаганьне гэтае кожнаго году мело той самы выгляд: пад восень бог цемні перэмагаў сонцэ, яно хавалося на даўжэйшы час, ноч станавілася штораз большай, значэ, штораз болей разшыралося панаваньня бога цемні, чорнабога.

Але бог сонца, бог дабра, сьветласьці абараняўся і у канцы сьнежня, сонцэ пачынае дужэць, дзень прыбываць.

Колісь нашы прашчуры верылі так. Чорнабог, перэмагаў сонцэ,—меней болей у час Змітроўскіх цяперэшніх дзядоў,—сонцэ траціло сілу, малело, кідало бледны блеск на зямлю, пачыналося панаваньне Чорнабога—сьцюжа, цемня, сьвіст і завываньне ветроў сцюдзёных... —„Хто ведае,—думаў наш прашчур,—мо сонцэ саўсім замрэ, а тады на зямлі настане безканечная ноч, сьмерць і заглада ўсяму жывому“.—Але от сонцэ пачынае прыбываць, у сэрцэ ўступае надзея, што сонцэ ізноў акрэпне, ізноў зазелянеюць і поле і лес, настане на зямлі жыцьцё і гоман і песьні.., Як-жэ не радавацца з гэтаго? І радаваліся людзі і пеялі песьні і стараліся растлумачыць сабе, як і чаму гэта сталося? Тлумачылі сабе пагане славяне, што. маці сонцэ, Каляда Грамавіца выбавіла ад сьмерці сонцэ, адрадзіўшы яго на нова. Яна, каб уратаваць сонцэ ад Чорнабога, прыняла яго у нутро сваё, а каб змыліць ворага перакінулася сама белай казой і радзіла маладое сонцэ. Яно цяцер маладое, бледнае ешчэ, але Чорнабог паконан, ён сонца маладога, ня здужае перэмагчы, і хоць не адразу уступае яму, але сонцэ, падрастаючы, зганяе з зямлі сьцюжу і цемру; ў чэрвені, само сонцэ сьвяткуе перамогу сваю над Чорнабогам іграючы, ці бач скачучы, перад усходам на Купальле.

Ня дзіва што людзі цешыліся с перамогі яснаго сонейка. У пэрсоў даўней у час нашых Каляд. сьвяткавалі „Міграў“, сьвята нарадзін сонца; у часе гэтаго сьвята устраіваліся гульні, людзі віншавалі сабе, давалі падаркі. У індусоў сьвяткуюць, як і у нас, сьвята перамогі сонца падназваньнем „Каляды“. Там, у Індіі, людзі расказываюць, што на куцьцю у Божым палацы расквітаюць дрэвы з залатымі лісьцямі, а на ложку, пакрытым кветкамі родзіцца сонцэ.

Калі-ш спрадвечная праўда, Сын Божы радзіўся, прастарые звычаі і абычаі прыбралі іншы характар. Са старых апісаньнёў ведаем, што у першые векі хрысьціянства у нас, пры дварох князёўскіх, адбываліся гульні і ігрышчы на Каляды. Хадзілі скамарохі з мядзьведзямі, вадзілі „Казу“—перэадзетаго хлопца ў кажух, з казінай галоўкай на кісялёўцы і ў песьнях апевалі, як Грамавіца радзіла Сонцэ. Устраівалі маскарады, ці як цяпер кажуць нашы селяне, „перэадзеваліся за цыганоў“ і многа іншаго. Пры віленскім каралеўскім дварэ на Каляды за звычай выпушчалі шэсьць людзей с турэм, король раздаваў падаркі, устраіваліся на рынках публічные прэдстаўленьня, і інш. павіншаваньня песьнямі (шчэдроўкі).

Так было даўней, за дзядоў і прадзедоў нашых... Шмат чаго дахавалося з гэтых звычаеў і да цяперашняго часу, але бадай ешчэ болей загінуло, сплыло з людзкой памяці.

— Шчасьлівы той чэлавек, каторы вясёлы,—сказаў адзін мудрэц. А нашы дзяды-прадзеды умелі быць вясёлымі, умелі цешыцца з жыцьця! І вось, як падумаеш, сколькі на гэтые сьияткі было даўней гоману, сьмеху вясёласьці, шкада робіцца, што убыло у нас цяпер шчасьця, што мы ужо не патралім так весяліцца...

Да таго год сёлетні цяжкі!.. Не ў аднэй сямейцы, на пачэсным мейсцы, на покуці будзе пустое мейсцо, і на вачах маці, і жонкі закруцюцца сьлёзы па дарагім сыне, ці мужу, каторы у далёкай старонцы, здалёк ад сямейкі сустрэне гэтае вялікае сьвята. Не плачця, гаротные! Дасьць Бог дачэкаемся другіх сьвятак, весялейшых. Судзі толькі, Божэ, дачэкацца іх у добрым здароўі, у памыснасці... Судзі, Божэ, мінуцца толькі навалі, каторая хмарай аблажыла старонку, каб змоўклі гарматы, уціхлі стогны калек, абсохлі сьлёзы смутлівых матак.

**Власт.**

---

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Ураджай**. Віленскае губэрскае прысутство сабрало весткі аб сёлетнім ураджаі у віленскай губэрні. У круглых цыфрах (у пудах) вось сколькі выходзе ураджаю: 1) на прыватных землях (не селянскіх): жыта 10 мільёноў пудоў (на 1 мільён меньш, як у 1913 г.), аўса 4 с паловай мільёны (на поўмільёна меньш бульбы) 22 с паловай мільёны (на 5 мільёноў меньш), буракоў 248 тысяч (у двое меньш). 2) На селянскіх землях: жыта 13 мільёноў (на 2 мільёны меньш), ярыны 4 мільёны (на 2

---

вей. Салятырку у гэты мамэнт ён любіў і жалеў шчырэй, як роднаго брата, і гатоў быў пабожыцца, што нема лепшаго чэлавека ў сьвеці, як Салятырка. Калі бабы запеялі «Кум да кумы су паўночы прыхадзіў», дык ён памагаў ім так шчыра. так пры гэтым тыжыўся, што аж з лысіны цякло, і твар падобны быў на скумат чырвонай суконкі. Песьня яму гэтак спадабалася, што аж ён, як кончылі пеяць, запытаўся у кумы:

— А што-б ты рабіла, каб так гэта я да цябе падыйшоў?

— Нічога.

— Атчыніла-б?

— Атчыніла-б.

— А тады?..

— А тады? Сказала-б—цюцька! парві яго!..

Уся застоліца схапіўшыся за жываты рагатала. Арцёму неяк спачатку стала крыўдна, а пасьля зрабілася так, што ён нізашто ня мог сьцяміць, хто разумней сказаў—ці ён, ці кума? і с каго сьмяюцца? Разсудзіўшы ў канцы-канцоў, што ў сьмех усю кумпанію увёў ня хто іншы, а ён—Зграбны, пачаў і сам рагатаць з здаволенай і шчасьлівай мінай.

Пачалі дарыць на мыла, і бабы учапіўшыся за яго запеялі:

«А наш Арцёмка добры госьць,
Казалі ў яго грошы ёсьць
А наш Арцёмка сорам знай—
Бабцы на мыла рубля дай!
А наш Арцёмка нетакоў—
Пасыпіць жменю пятакоў.
А наш Арцёмка маладзец—
Ды ён паложыць чырвонец!»

Арцём дастаў партманэт і з вялікай важнасьцю палажыў на талерку апошніх тры рублі. За гэткі багаты падарунак ён колькі разоў павінен быў выпіваць поўную чарку, каб дастаць пакладзены на дно кавалак цукру.

Рухнулі вазіць бабу.

«Ды вы запрагайця,
Ды вы закладайця
Ды дванаццаць валоў,
Ды вы адвязіця,
Ды вы адашліця
Нашу бабку дамоў...»

пеялі бабы. Учапіўся за аглобліну і Арцём. Яму здавалося, што ён адзін павязець ня горш дванаццаці валоў, але ногі кепска служылі. Арцём закрануўся, зашалматаўся і... паваліўся. Баба с павозкай пераехала цераз яго. У тым руху, ды ў гомане на Арцёма мала хто і глядзеў, мала хто аб ім і думаў. Бабу павязьлі, а ён і астаўся.

Палежаўшы трохі, Арцём дадумаўся, што пачаў рабіць не зусім ужо зграбна,—пры тым пад ложэчкай пачало круціць, вярцець. ташніць... Фэ!.. Вось ён падняўся і. барануючы па дарозі нагамі, паплёўся у гумно. Падыйшоў да пуні, сеў, прысланіўся да сьцяны і... заснуў—сам не пачуў як.

«Ды дзенькую таму,
У чым я даму
Хлебам сольлю накарміў,
Гарэлкай напаіў
І дубіну ў рукі даў,
Дарожэчку паказаў.

пеялі расходзячыся ўжо пад дзень апошніе госьці. Песьня разбудзіла Зграбнаго.

«Дзе гэта я?» — аткрыўшы вочы, здзівіўся Арцём. Было цёмна, як у мяху, ён сядзеў на голай і сырой зямлі, — сабакі лізалі яго, скалючы адзін на аднаго зубы; пахла карасінай, шкупікарам і яшчэ, чорт знаець, чым. Мала-памалу Арцём дагадаўся.

Праклятая Салятырка!..

Сстрахануўшысі, аправіўшыся і пашчупаўшы, ці пры боку шашка, Зграбны, туляючыся, каб і людзі ня відзелі, паплёўся дамоў.

Даўно ўжо Зграбнаму было так дрэнна і трудна, як цяпер. У галаве стрэлялі пісталеты. Здавалася, што мазгі аддзеліліся ад чэрэпа. Унутро бытцам хто галавешку усадзіў. С-пад носу... фэ!.. Дрыжака... бррр... усе суставы перэбірала, зацінала дух. І стыдна, і крыўдна і злосьць... «Праклятая Салятырка!» Колькі разоў Зграбны астанаўліваўся і матаў кулаком у той бок, дзе жыў Салятырка. «Будзеш ты мяне знаць, праклятая Салятырка! папомні мае словы!..»

Не дачэкаўшы Арцёма з вечэра, жонка разсудзіла, што ён да дня ня прыдзець і заперла на засаўку сені. Пад дзень яна смачна заснула, і не пачула скора, што Арцём стукаецца у дзьверы. Пакуль яна прачхнулася, устала і выйшла атчыняць, ён ужо пасьпеў узлавацца і з нецярплівосьці хацеў выламаць дзьверы. Толькі гэта ён упёрся, а жонка тымчасам і атчыніла. Арцём з усіх чэтырох і брыкнуў проста ёй пад ногі.

— Ах, каб ты лепі аттуль не вярнуўся!.. Прыйшоў с пустымі рукамі, ды яшчэ й дзьверы ломіць. Нарэзаўся-ж вось, каб ты яе нявыдыхаў!..

— А хто-ж княгаў? Хто не даваў мне супакою? Хто выпраўляў, калі ня ты?.. Схадзі, накрый Салятырку! Каб ты так і нагамі накрылася!.. Схадзіў — на сваю галаву. Тры рублі яшчэ на мыла вымазалілі... Чорт!..

Агрызнуўшыся, Арцём палез на печ грэцца, а Арцёміха узялася атчытываць яго за тры рублі.

**П. Б.**

19—28/XI—14 г.

міл.(на 2 м. меньш) аўса каля 5 мільёноў (на 1 мільён меньш), бульбы 22 с паловай мільёны (як ў 1913 г.), буракоў 197 тысяч (на 100 тысяч меньш). Найважнейшая прычына зменьшэньня сёлетняго ураджаю—быўшая вясною і ў пачатку лета суш.

**Хаўрусны банчок.** У Крайску, віленск. павету, пазволена аткрыць хаўруснае крэдытовае таварыство. Аснаўны капітал у 3000 р. пажычаець таварыству казна з варункам кругавой парукі усіх хаўрусьнікоў, на выплату праз 13 год. Пажычаць кожны хаўрусьнік не мае права болей, як 200 руб. Хаўрусьнікі усе за аднаго атказываюць за абавязкі і страты таварыства.

**Карова каня з'ела.** (Ад нашаго карэспандэнта). У засьц. Перакорка, вілейск. пав., аднаму тутэйшаму гаспадару здарылося нешчасьце, праз малы ці ўжо натта вялікі розум. Узяўшы за каня, забранаго пад вайну, каля двухсот рублёў ды далажыўшы яшчэ колькі рублёў дамашніх ён схаваў усё гэта, завязанае ў вузялок, у ложка. Праз некольki дзён жонка выкінула салому з ложка у хлеў, дзе стаяла карова, а с саломай—і грошы. Карова любіла есьці тканіну, дык і зьела тую анучыну с паперовымі грашыма.

**Для дзяцей.** У Вільні таварыство лекарска-харчэвой помачы пацярпеўшым ад вайны аткрыло 15 сьнежня 1914 г. на Завальнай вуліцы, № 5, амбуляторыю для дзяцей. Хворых дзяцей будуць лячыць і даваць ім харчы дарма, калі будзе прэдстаўлено сьвядоцтво, што бацькі іх уцяклі з роднай стараны, або ўзяты з запасу. Хворые прыймаюцца у кожны аўторак, сераду, чацьвер і суботу—ад 9 да 11 гадзіны раніцай, а ў панядзелак і пятніцу — ад 3 да 5 гадзіны у дзень. У гэтые-ж гадзіны запісываюць хворых дзяцей, да каторых доктару трэба самаму прыехаць у іх хаты.

## З Міншчыны.

**Арышт «Сахі».** Мінскі віцэ губэрнатор налажыў арышт на № 26 беларускаго месячніка «Саха» за надрукаваньне нумэра бяз потпісу рэдактара. Рэдактар будзе атказываць па 3 п. 1012—2 ст. ул. о нак.

**Штраф.** На рэдактара газэты «С З. Мысль» наложэна штрафу 150 р. або арышту на 1 месяц за стацьцю ў № 51 «Путевыя впечатлѣнія».

**Расходы мінскаго павету:** утрымліваньне земскаго упраўленьня 26,568 р., дарожная павіннасьць 4587 р., грамадзянскі дагляд («общ. призрѣніе») 29,859 р., мэдыцына (лекі) 90,063 р., вэтэрынарыя (лячэньне жывёлы) 6,020 р., расходы на гаспадарку 10,560 р. Паветовы земскі збор з павету злічэны на 176,123 р.

**Паны мінск.** губ. ападаткавалі сябе зборам с кожнай дзесяціны на карысьць сем'еў запасных. Паны пінскаго павету сабралі гэткім чынам 5077 р., а рэчыцкаго—2708.

**Рэкі.** Барысоўскае земскае сабраньне пастанавіло хлапатаць перэд урадам аб хутчэйшым наладжэньні на рахунак казны семнацаці рэк у павеці, у тым ліку вялікай караблеходнай рэкі Бярэзіны у районе (аколіцы) Барысава. Звернуто увагу на тое, што забалочэнасьць рэк замінае сплаву і не дае магчымасьці гаспадаром карыстаць с падрэчных сенажацеў.

**За нечыстату** на фабрыцэ сухароў мінскі губэрнатар аштрафаваў у Мінску на 3000 р. гаспадара гэтай фабрыкі М. Фрыдлянда.

**За гарэлку.** У Мінску дастаў тры месяцы арышту ў турме фрызьер (цырульнік) П. Мороз за патайную продаж гарэлкі.

**192 манапольки** скасована на заўсёды у мінскай губ., у тым ліку 4 у самым Мінску.

**Працi бабруйскіх вывакоў.** Мінскі губэрнатар стрымаў пастанову бабруйскай гарадзкой думы аб захаваньні ў горадзе усіх шынкоўняў і перэдаў гэту пастанову на развагу губэрскаго аб гарадзкіх і земскіх справах прысутства.

**Пажары.** У Мінску 15 сьнежня згарэла дзерэвяная цэрква, пабудаваная на конным пляцу.

**Праз нязгоду.** У Бабруйску мейсцовая жыхарка Х. Мазін с прычыны хатняй нязгоды заліла свайму мужу вочы вітрыволем і зьнікла. Вечэрам яе знайшлі на рэйках чыгункі з адрэзанымі нагамі. Прывезеная у бальніцу—сканала.

**Вечная катарга за атруцьця.** У Барысаве акружны суд засудзіў на вечную катаргу селяніна Апанаса Хількевіча за тое, што атруціў стрыхнінай свайго стрыечнаго брата з мэтай скарыстаць з яго спаткаў.

# З усіх старон.

**Аб ваеннапалонных.** Пісьмы на імя расейскіх ваеннапалонных у Нямеччыне і Аўстрыі могуць быць адрэсаваные або проста ваеннапалоннаму, калі адрэс яго вядомы, або ў цэнтральнае справочнае бюро для ваеннапалонных у Петраградзе, калі ня ведама аб мейсцы прабываньня ваеннапалоннаго. У абодвух здарэньнях трэба на пачатку адрэсу пісаць *военнапалонному* або *палонному* такому-то. Як пісьмо так і адрэс могуць быць напісаны *хоць у якой мове апрача жыдоўскай*. Грошы найлепей пасылаць пераводамі і найлепей не па шмат: па 10, 15, 25 і 50 р.

**Весткі аб ваяках.** Гурток петроградзкіх студэнтоў, каб прыйсьці с помачу тым, хто хочэ даведацца аб долі свайго блізкаго на вайне, прыняў на сябе абавязак наводзіць аб ваяках спраўкі. Каб атрымаць такую вестку, трэба у пісьме да гуртка абавязкова падаць: 1) імя ваякі, 2) імя па бацьку, 3) прозвішчэ (фамілію), 4) у якой часьці войска служыць, 5) ваенны чын (салдат, унтэр-афіцэр і г. т.), 6) якой губэрні, павету і воласьці. Для атказу трэба канечна прылажыць пачтовую марку за 10 кап. Спраўкі пасылаць на гэткі адрэс: *Петраградъ, Сімбірская ул. д. № 33 кв. 6. Студэнту К. Каппер.*

**Ваякі на чыгунках.** Міністэрство дарог пастанавіло прыймаць на службу на чыгунках выздараўліваючых раненых і пакалечэных салдат, калі іх работа ня будзе небаспечнай для руху поездоў. Напрыклад, можэ нават паступіць на службу такі, каторы асьлеп на адно вока, але другім бачыць добра.

**На перавозкі раненых і хворых** ваякоў с каўказкаго фронту рада міністроў выдала для хаўрусоў гарадоў і земстоў 2 мільёны 500 тысяч руб. **Адвакаты і вайна.** Ваенные ўласьці забаранілі адвакатам (прысяжным паверэнным), пакліканым у войска, выступаць на судзе і весьці судовые справы.

**Награда за самалёты.** Петраградзкі губэрнатар апавесьціў, што глаўнакамандуючый арміей прызначыў награды 5,000 руб. кожнаму, хто дапаможэ выкрыць і злавіць непрыяцельскі самалёт; за знiстожэны самалёт награды будзе 10.000 р.

**Сьвяткаваньне.** Александоўскі камітэт для помачы раненых пастанавіў пасьля вайны устроіць па ўсей Расеі народные сьвяткаваньня. У Туле ужо апрацавалі праграму сьвяткаваньня для тульскай губ.

**Для пацярпеўшых праз вайну.** Петраградзкаму славянскаму таварыству дабрачыннасьці пазволена зьбіраць складкі па ўсей дзяржаві на карысьць пацярпеўшых праз вайну сэрбоў, чорнагорцоў і украінцоў у Галіччыне і ў Буковіне.

**Палягчэньня дла сасланых.** Міністэрство ўнутрэнніх спраў разьясьніло, што асобы, прымусам выселеные за благіе пастуркі па прыгавару селянскіх сходаў, могуць вертацца дамоў, за згодай губэрнатора, у якога губэрні сасланы жыве, з губэрнатарам, з якога губэрні высланы.

**За зьневагу арміі.** Петраградзкі акружны суд засудзіў рэдактара газэты «Русское Знамя» на 3 месяцы у турму за надрукаваньне стацьцей пад загалоўкамі «Военныя замѣтки», у якіх дагледжэна зьневага арміі і інш.

**За выкруты ад ваеннай службы.** Сэнат не ўважыў просьбы аб адмене прысуджэнай кары чыном смаленскаго прысутства аб воінскай павіннасьці і 27 дзяцюком, адбываўшых прызыў, засуджэны: два чыноўнікі прысутства ў катаржные работы за патпал дакумэнтоў прысуства з мэтаю скрыць праступак, два доктары — за праступак аб асвабаджэньні новабранцоў ад ваеннай павіннасьці, 27 адбываўшых прызыў—у турму на тэрмін ад 5 месяцоў да 1 году.

**За нямецкую гутарку.** Камэндант рэвэльскай крэпасьці налажыў кару на рэвэльскіх мешчан Бэклера і Раскаля, каторые гутарылі між сабою па нямецку у буфэце гасьцініцы «Hotel du Nord». Бэклер аштрафованы на 3000 руб. або 3 месяцы арышту, а Раскаль—на 25 руб. або арышту 7 дзён.

**Піўные бравары.** У Фінляндзкай губэрні зачынілася 15 піваварных бравароў. У іх лічбе спынілі працу вядомые бравары Вальдшлехсэн, Тангэйзер, Стріцкі і Кіммэль. А такжэ зачыніўся гарэлачны бровар Вольдшмідта

**Змаганьне с п'янствам.** З мэтай змаганьння с п'янствам у Рызе ўласьці зачынілі на заўсёды 200 рэстараноў і тракціроў і каля 500 піўных.

**Для латышоў і эстонцоў.** Як паведамляе «Рижская Мысль», упраўленьне рыжскаго навуковаго округу маніцца апрацаваць праграмы (правілы) аб навучаньні латыскай і эстонскай мовы у вышэйшых пачатковых і срэдніх школах.

**У Польшчы.** Урад пастанавіў ўстрымаць да часу прымусовае ўзысківаньне падаткоў і нядоімак, не налічаючы штрафаў і працэнтоў, ў губэрнях: варшаўскай, калішскай, келецкай, ломжынскай, люблінскай, петракоўскай, плоцкай, радомскай, сувальскай і холмскай.—Усяго сабралі у Петраградзе для палякоў у так званы дзень «Петраград — Польшчы» 275,590 руб. — Варшаўскіе газэты падаюць лічбу узрывоў у Варшаве ад пачатку вайны да гэтаго часу: с прычыны узрывоў у верэсьні забіло 3 людзей, у кастрычніку, пры 34 узрывах прыплаціло жыцьцём 34 асобы, раны атрымало—85, у лістападзі ад 7 узрывоў памёрла 3 людзей, атрымалі раны—5, у сьнежні пры 11 ўзрывах 1 чэлавека забіло на мейсцы, а 2 раніло. Агулам-жэ праз 4 апошніе месяцы, пры 95 ўзрывах, забіло на мейсцы або памёрла ад ран 41, а раненых 92 людзей.

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**


Прыймаецца падпіска на 1915 год на беларускую газэту

# „НАША НІВА“

**ГОД ВЫДАВЕЦТВА X.**

«НАША НІВА» як і тые гады будзе працаваць над адраджэньнем **Беларусі,** шырыць беларускую сьведомасьць, бараніць **інтэрэсоў** гаротнаго беларускаго народу.

«НАША НІВА» у публіцыстычным аддзелі друкуе стацьці на палітычные, экономічные і національные тэмы, лепшых беларускіх публіцыстоў; у бэлетрыстычным аддзелі дае апаведаньні, сцэнічные творы і вершы, лепшых бэлетрыстоў і паэтоў. Апрача гэтаго дае многа вестак з жыцьця на Беларусі і з усіх старон. У вясковым жыцьці «НАША НІВА» заменяе сабой штодзенную часопісь.

Цэна «НАШАЙ НІВЫ» на год с перасылкай—2 р. 50 кап.; на поўгода—1 руб. 25 кап; на 3 месяцы—65 к.; на 1 м. 25 к.

Усе гадавые і поўгадавые падпісчыкі атрымаюць дарма „**Беларускі Календар**“, які заслужыў ужо некольки наградаў на краёвых выстаўках.

*Пробные нумэры высылаюцца дарма.*

**Усе, каму дорага справа адраджэньня беларусоў да культурна-національнаго жыцьця, выпісывайця, чытайця і шырця „НАШУ НІВУ“.**

Адрэс рэдакціі: **Вільня, Віленская 29.**
Рэдактар-Выдавец **І. Луцэвіч.**



Выйшоў з друку

# „БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР“

**на 1915 год.**

двумя асобнымі выданьнямі, з асобным тэкстам рускімі літэрамі і з асобным тэкстам лацінскімі літэрамі.
**Выпісываць з „Беларускай Кнігарні“, Вільня Завальная 7.**
Кнігарня просіць прысылаць заказы на календар загадзя, бо у гэтым гаду на палавіну меней друкавана календара і ён хутка разойдзецца. **Цэна без перасылкі 10 к., с пер. 15 к.**
*На пробу календары не высылаюцца.*


Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.